ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
28
КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 16 (1392)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
•Учора • Сёння • Заўтра•

### АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПЛЕНУМ

камітэта камсамола універсітэта вызваліў ад абавязкаў сакратара камітэта камсамола Аляксандра Рухлю ў сувязі з пераходам на іншую работу.

Сакратаром камітэта камсамола выбраны Аляксандр Казулін.

Ю. ВАРАТНІЦКІ,
кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола.

### ПРАЦЯГВАЮЦЦА СПАБОРНІЦТВЫ

па праграме спартакіяды «Здароўе» сярод супрацоўнікаў універсітэта. На гэты раз спрэчку вялі шахматысты. У камандным заліку на першае месца выйшлі спартсмены НДІ ПФП, другое месца ў каманды фізічнага факультэта, на трэцім — шахматысты вылічальнага цэнтра.

М. КУЧЫНСКІ,
старшыня спартыўна-масавай камісіі прафкома.

### НА ПАСЯДЖЭННІ

бюро камітэта камсамола было разгледжана пытанне аб рабоце навуковага студэнцкага савета універсітэта. Адзначана, што работа савета пабудавана ў адпаведнасці з палажэннем аб НСС і планам работы савета універсітэта і факультэтаў.

У прынятай пастанове намечаны комплекс мерапрыемстваў па далейшаму паляпшэнню работы навуковага студэнцкага савета.

А. МАТУСЕВІЧ,
член прэс-цэнтра камітэта камсамола.

### УРАЧЫСТЫ СХОД

замежных студэнтаў, прысвечаны 5-й гадавіне Красавіцкай рэвалюцыі ў Афганістане, праведзены па ініцыятыве партыйнага камітэта універсітэта.

У. БУДАЙ,
кіраўнік інтэрпрэс-цэнтра.

### АБМЕРКАВАНЫ ВЫНІКІ

рэйдаў па выяўленню парушальнікаў вучэбнай дысцыпліны, па кантролю за эканоміяй электраэнергіі ў інтэрнатах. На чарговым пасяджэнні штаба «Камсамольскага пражэктара» таксама вызначаны ўмовы правядзення конкурсу насценгазет «пражэктарыстаў», які будзе прысвечаны Дню друку.

І. ЗЫБАЙЛА,
член штаба «КП» універсітэта.

**НЯХАЙ ЖЫВЕ 1 МАЯ — ДЗЕНЬ МІЖНАРОДНАЙ САЛІДАРНАСЦІ ПРАЦОЎНЫХ У БАРАЦЬБЕ СУПРАЦЬ ІМПЕРЫЯЛІЗМУ, ЗА МІР, ДЭМАКРАТЫЮ І САЦЫЯЛІЗМ!**

(З Заклікаў ЦК КПСС).




## Свята міру і дружбы

Праз некалькі дзён усё прагрэсіўнае чалавецтва будзе адзначаць свята Першамая. Заваяваны пралетарыятам, сёння ён служыць усім, хто адстойвае свабоду, роўнасць, братэрства. У гэты дзень позіркі людзей свету будуць звернуты да радзімы вялікага Леніна, лозунгам якой сталі словы: «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!». Гісторыя не ведае дзяржавы, якая ў такі кароткі час зрабіла б так многа для ўсебаковага развіцця нацый і народнасцей. Прыклад Савецкага Саюза, яго гістарычны вопыт маяком асвятляюць шлях прагрэсіўнаму чалавецтву ў барацьбе за раўнапраўе і дружбу паміж народамі, за рэвалюцыйнае абнаўленне планеты.

З чырвонымі сцягамі міру і дружбы, з веснавымі кветкамі выйдуць на першамайскую дэманстрацыю працоўныя рэспублікі. У адной шарэнзе будуць крочыць у гэты дзень рабочыя і калгаснікі, вучоныя і дзеячы культуры, моладзь і ветэраны.

Разам са сваімі савецкімі сябрамі адзначаць свята міру і дружбы студэнты з 57 краін свету, што займаюцца ў БДУ імя У. І. Леніна. Іх вучоба ў нашым універсітэце—адно з праяўленняў пралетарскага інтэрнацыяналізму, міжнароднай салідарнасці народаў усяго свету.

Клопат і трывога аб будучыні планеты згуртавалі людзей розных палітычных поглядаў і параканання̆ў. Толькі сумеснымі намаганнямі ўсіх людзей добрай волі можна даць рашучы адпор агрэсіўным падкопам імперыялізму, мілітарызму і рэакцыі. Рашуча выступаюць народы еўрапейскіх краін супраць размяшчэння ў Заходняй Еўропе новай ракетна - ядзернай зброі. За мір змагаюцца прагрэсіўныя людзі ўсіх кантынентаў, усіх дзяржаў. Гэты рух узнік з пільнай патрэбы нашага часу — прадухіліць ядзерную катастрофу, забараніць назаўжды варварскія сродкі знішчэння людзей.

Урачыста адзначае наш народ разам з народамі ўсяго свету 1 Мая — Дзень міжнароднай салідарнасці працоўных у барацьбе супраць імперыялізму, за мір, дэмакратыю і сацыяльны прагрэс. Радасна сустракаюць свята шматлікая і дружная сям'я студэнтаў, калектыў выкладчыкаў і супрацоўнікаў Белдзяржуніверсітэта. Цвёрда трымаюць яны ў сваіх моцных руках сцяг савецкай адукацыі і навукі, які ўручылі ім Радзіма, партыя Леніна. Год ад году растуць і будуць расці іх навуковыя здабыткі, поспехі ў вучобе.

Са святам Першамая, таварышы!

ПАРТКОМ
РЭКТАРАТ
ПРАФСАЮЗНЫЯ КАМІТЭТЫ
КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.

...І ПЯЦЬ СТУДЭНЦКІХ ГАДОЎ

## МЫ ЎДЗЯЧНЫ ТАБЕ, БДУ!

...УСПАМІНАЮЦЦА ЛЕТА 1978 года, уступныя экзамены. Як мы тады зайздросцілі студэнтам, якіх сустракалі ў інтэрнаце ці ў прыёмнай камісіі: яны ўжо паступілі, ужо вучацца і самі, напэўна, не разумеюць свайго шчасця!

Потым быў першы сход, атрыманне студэнцкіх білетаў, першае знаёмства з групай... Усё было ўпершыню. А зараз — як жа хутка! — надышоў час падводзіць вынікі.

Што даў мне універсітэт за гэтыя гады? Перш за ўсё, веды па выбранай спецыяльнасці. І не толькі пэўны фактычны матэрыял — уменне знаходзіць унутраную сувязь, рабіць абагульненні, бачыць сутнасць гістарычных з'яў. Потым — магчымасць пабываць у археалагічных экспедыцыях, непасрэдна далучыцца да жывой гісторыі краіны. Універсітэт дапамог мне знайсці сапраўдных сяброў. Вучоба, грамадская работа навучылі працаваць з людзьмі. За пяць студэнцкіх гадоў я зразумела, што значыць быць самастойнай, як самой перадольваць узнікаючыя цяжкасці. Думаю, гэта вельмі спатрэбіцца ў будучым. І яшчэ адно: я прыехала сюды з невялікага гарадка. Лічыла і лічу, што Мінск — адзін з самых лепшых гарадоў краіны. Думаю, пяць гадоў жыцця ў такім буйным культурным цэнтры далі мне многае. У гэтым таксама (няхай ускосна) адбіўся ўплыў універсітэта.

Пяць студэнцкіх гадоў амаль што прайшлі. Я атрымала спецыяльнасць, набыла некаторы жыццёвы вопыт. Ні аб чым не шкадую, акрамя аднаго: з задавальненнем правучылася б ва універсітэце яшчэ, нават калі б давялося пачынаць з самага пачатку. Нездарма лічыцца, што студэнцкія гады— лепшыя ў жыцці.

І. КУЛАКОВА,
студэнтка гістарычнага факультэта.

БЕЗ ПЯЦІ МІНУТ маладыя спецыялісты, мы ў думках звяртаемся да вучобы ў БДУ імя У. І. Леніна. Як многа даў нам універсітэт! Гэта — і моцная дружба, і прага пошуку, і першыя крокі ў навуку.

У нас на гістарычным факультэце існуе мноства навуковых гурткоў. Для мяне родным быў і застаецца гурток «Старажытны свет і сучаснасць» — равеснік майго студэнцкага жыцця. Іменна тут мы спрабавалі свае сілы як навукоўцы, тут гучалі нашы першыя нясмелыя выступленні, тут рыхтаваліся грунтоўныя даклады да студэнцкіх навуковых канферэнцый.

Мы ўдзячны сваім выкладчыкам за тое, што яны ўбачылі ў кожным з нас ледзь прыметныя здольнасці, развівалі іх, накіроўвалі кіпучую студэнцкую энергію ў патрэбнае рэчышча.

Хутка мы назаўсёды развітаемся з універсітэтам. Вясёлыя і цяжкія студэнцкія гады з іх сесіямі і канікуламі, «бульбамі» і «капуснікамі», практыкамі і будаўнічымі атрадамі застануцца ва ўспамінах. Як і гонар за цябе, родны універсітэт!

А. ВЕРАШЧАГІНА,
студэнтка гістарычнага факультэта.

# БДУ — ВА «Інтэграл»

**Шырацца гарызонты сувязей паміж БДУ імя У. І. Леніна і вытворчым аб'яднаннем «Інтэграл». Сёння ў нас у гасцях шматтыражная газета «ИНТЕГРАЛ». Яе карэспандэнты расказваюць аб здзяйсненнях і клопатах працаўнікоў прадпрыемстваў, дапамагаюць адчуць «біццё пульсу» перадавога калектыву, з якім мы супрацоўнічаем і дзе працуюць нашы выпускнікі.**

## Захопленасць

СТАРШЫ МАЙСТАР Анатоль Махнач падняў тэлефонную трубку. Па выразу яго твару няцяжка было здагадацца, што навіна атрымана не вельмі прыемная. Сказаўшы кароткае «добра», ён рашуча ўстаў і выйшаў са свайго пакоя.

Пастаяў некаторы час, уважліва разглядаючы рабочых, затым сказаў:

— Іван Іванавіч, прашу да мяне.

Невысокага росту рабочы «адарваўся» ад ціскоў. Паглядзеў запытальна на майстра і жэстам перапытаў: «Мяне?»

— Вас, — кіўнуў галавой Махнач. І калі рабочы падышоў, сказаў:

— На іскравым участку адзін станок барахліць. Просяць тэрміновай дапамогі. Патрэбна паглядзець і выправіць.

Мужчына зразумеў з паўслова і накіраваўся да свайго рабочага месца. Адкрыў інструментальную шафу, узяў невялікую скрынку і пакрочыў на іскравы ўчастак...

Сярод тых, хто «лечыць» станкі, асобым уменнем і стараннем вызначаецца наладчык Іван Іванавіч Нікалайчук.

— Шаснаццаты год працую ў цэху наладчыкам, — скупа расказвае пра сябе Нікалайчук. — Праца ў нас такая: калі ўсе станкі працуюць, мы спакойныя, можна нават і газету пачытаць.

— А калі непаладкі?

— Тады забываем нават пра час. Здараецца, што і трэцюю змену прыхопліваем.

Працоўны стаж Івана Іванавіча налічвае тры дзесяткі гадоў. Яшчэ зусім юным прыйшоў на завод імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Доўга не думаў пра выбар прафесіі: пажадаў стаць слесарам-наладчыкам — і стаў ім.

Пра сябе Іван Іванавіч расказвае неахвотна. На пытанне: як працуеце? — адказвае коратка: як і ўсе.

Але пра яго добрыя справы красамоўна сведчаць шматлікія прыклады. У цэху вельмі складаныя станкі, многія з лічбавым праграмным кіраваннем, з высокай дакладнасцю апрацоўкі. Разабрацца ў сістэме такога агрэгата нялёгка, не кожнаму наладчыку пад сілу. А вось Іван Іванавіч спраўляецца. Ён аднолькава паспяхова рамантуе фрэзерны станок для пярвічнай апрацоўкі габарытаў і складаны каардынатны ці оптыка - шліфавальны.

— Металаапрацоўчая тэхніка ўскладняецца, — заўважае Іван Іванавіч, — таму наладчыку трэба ўвесь час удасканальваць свае веды. Без гэтага сёння ніяк нельга.

Пра тое, што Іван Іванавіч Нікалайчук працуе бездакорна, гаворыць наступнае: ён узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём «За доблесную працу», быў пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва ў ІХ і Х пяцігодках. Не здае перадавых пазіцый і ў адзінаццатай.

Сваю захопленасць працай перадаў і сыну. Той, праўда, абраў іншую прафесію, стаў электрыкам, працуе ў трыццаць шостым цэху. Заўваг па рабоце не мае.

...У цэху стаіць роўны гул працуючых станкоў. Па праходзе нетаропка ідзе слесар-наладчык Іван Іванавіч Нікалайчук. Не проста праходжваецца — яго натрэніраваны слых ловіць «галасы» працуючай тэхнікі. Вось ён паскарае крок, падыходзіць да станка, за якім працуе малады токар, жэстам просіць спыніць станок.

— Падазрона шумяць шасцерні, — тлумачыць Іван Іванавіч. — Трэба паглядзець. Лепш папярэдзіць паломку, чым потым яе выпраўляць, — і схіляецца над станком...

Паважаюць у цэху слесараналадчыка Нікалайчука за працалюбства, уменне і захопленасць у працы.

**А. ШУРПАЧ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

## Дасягнутае — не мяжа

**ГУТАРКА З ЛАЎРЭАТАМІ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ БССР**



**В. Ю. Яшчак**



**У. П. Васілевіч**



**Л. В. Апановіч**

СЛОВА «НАВАТАР» вельмі дакладна вызначае сутнасць таго неспакойнага племя людзей, для якіх асноўным жыццёвым і творчым прынцыпам заўсёды з'яўляецца думка пра тое, што дасканаласці няма межаў.

Намеснік начальніка цэха № 21 Лявон Васільевіч Апановіч і намеснік начальніка цэха № 25 Васіль Якаўлевіч Красніцкі, інжынер-тэхнолаг цэха № 21 Вячаслаў Юр'евіч Яшчак і начальнік лабараторыі аддзела галоўнага тэхнолага Уладзімір Паўлавіч Васілевіч адносяцца да такіх людзей. У мінулым годзе яны сталі лаўрэатамі Дзяржаўнай прэміі БССР. Гэта ганаровая ўзнагарода — прызнанне іх заслуг. Імі унесены дзесяткі рацыяналізатарскіх прапаноў, зроблен шэраг вынаходніцтваў.

Пра сваю работу і творчы пошук, пра дасягнуты поспех мы і папрасілі іх сёння расказаць нашым чытачам.

**— Дзяржаўная прэмія БССР — ганаровая ўзнагарода і вялікае прызнанне вашай працы. Якім шляхам вы прыйшлі да гэтага поспеху!**

**В. Ю. ЯШЧАК:** — Увогуле, я хімік па прафесіі. Палюбіў гэты прадмет яшчэ ў школе, а сур'ёзна стаў захапляцца, калі вучыўся на хімфаку БДУ імя У. І. Леніна. Дыпломную работу пісаў на нашым заводзе. Таму, калі прыйшоў у 1971 годзе сюды працаваць, дык ужо добра быў знаёмы з вытворчасцю. Ледзь не самым галоўным элементам працэсу ўкаранення становяцца добрыя чалавечыя адносіны, узаемная зацікаўленасць. Гэта я зразумеў, калі стаў працаваць у цэху № 21. Адразу ж у першы год падаў рацпрапанову. На сённяшні дзень маю 4 вынаходніцтвы і 25 рацпрапаноў, з якіх 17 укаранёна.

Напэўна, калі любіш сваю справу, дык заўсёды імкнешся да поспеху. Без гэтага нельга.

**Л. В. АПАНОВІЧ:** — Скончыў фізічны факультэт. Прыйшоў працаваць у 21-ы цэх майстрам. Гэта работа ў многім дапамагла ў маёй вынаходніцкай і рацыяналізатарскай дзейнасці. Лічу, што поспех залежыць ад творчай атмасферы ў калектыве.

**В. Я. КРАСНІЦКІ:** — Як вядома, наша работа праводзілася сумесна з МРТІ. Сёння амаль усе галіны навуковага пазнання патрабуюць калектыўных намаганняў. І паколькі прыродазнаўчыя і тэхнічныя навукі максімальна наблізіліся да вытворчых патрэб, такая садружнасць тым больш неабходна.

**У. П. ВАСІЛЕВІЧ:** — Калі чалавека нешта турбуе, не пакідае ў спакоі, — гэта ўжо немалая гарантыя поспеху справы.

**— Якія з вашых распрацовак, укаранёных у вытворчасць, вы лічыце найбольш важнымі!**

**В. Ю. ЯШЧАК:** — Адна мая рацпрапанова звязана з больш дасканалым тэхпрацэсам скарачэння расходаў каштоўных металаў. Эканамічны эфект ад яе ўкаранення склаў 120 тысяч рублёў.

**Л. В. АПАНОВІЧ:** — Маё першае вынаходніцтва ў 1973 годзе дазволіла рэзка павялічыць працэнт выхаду прыгодных прылад і павысіць іх надзейнасць. Эканамічны эфект склаў 40 тысяч рублёў. За кошт яго ўкаранення выпуск прадукцыі на адзінку плошчы ўзрос у сотні разоў.

**— Вы, напэўна, згодзіцеся з такой думкай, што творчы пошук бывае не толькі радасным, але нярэдка і пакутлівым. З якімі цяжкасцямі вы сустрэліся!**

**Л. В. АПАНОВІЧ:** — Цяжкасці, канешне, заўсёды ёсць. Але без іх, напэўна, не было б і таго яркага, радаснага пачуцця, калі тое, што ты прыдумаў на паперы, ажыццяўляецца ў справе.

**В. Я. КРАСНІЦКІ:** — Цяжкасці заўсёды ўзнікаюць пры ўкараненні новага.

**— Якія вашы далейшыя творчыя планы!**

**В. Ю. ЯШЧАК:** — Працаваць!

**Л. В. АПАНОВІЧ:** — Асноўны напрамак у рабоце — далейшае павышэнне надзейнасці прылад і, як гавораць, дасягнутае — не мяжа. Дзяржаўная прэмія БССР абавязвае нас да многага.

**В. Я. КРАСНІЦКІ:** — Галоўная мара — стабілізаваць сітуацыю ў цэху: давесці вырабы да нармальных працэнтаў выхаду прыгодных.

**У. П. ВАСІЛЕВІЧ:** — Перад лабараторыяй стаяць цяпер важныя задачы. Зараз займаемся больш складанымі вырабамі. Вопыт, назапашаны за гады работы, дазваляе больш аператыўна рашаць самыя разнастайныя праблемы. Хацелася б яшчэ дадаць: новая распрацоўка ў галіне тэхналогіі, асабліва складаных прылад, патрабуе стварэння творчых груп спецыялістаў, навукова-даследчых інстытутаў. Гэта дазволіла б хутчэй падрыхтаваць новыя вырабы да ўкаранення ў вытворчасць.

**І. САВЕРЫНА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

## ДАВЕРСЯ ДАБРУ І НАДЗЕІ



**Мне даўно хацелася расказаць аб гэтай жанчыне. Простай, звычайнай, вельмі сціплай, якая не мае высокіх званняў. І ў той жа час нечым вельмі прывабнай асобе. Чым! Дзіўным спалучэннем простага і складанага, прыземленага і ўзвышанага.**

**Я не прэтэндую на тое, што разгадала яе да канца. Гэта немагчыма. Ёсць людзі, якія ведаюць яе больш і, напэўна, лепш. Я толькі бачыла яе ў рабоце, на сцэне, на рэпетыцыях хору, з дзецьмі.**

### РАБОТА

Нехта з жанчын у канторы 23-га цэха, даведаўшыся, да каго я іду, сказаў: «Тамара Сяргей? Гэта тая, што спявае...». Так, яна спявае. У народным хоры аб'яднання. І працуе ў 23-м цэху кантралёрам. Больш за 10 гадоў на адным месцы.

Як я ні спрабавала разгледзець яе сярод падобных, як блізняты, жанчын у белых халатах і шапачках, — не атрымалася. Таму сустрэча аказалася нечаканай для абедзвюх. Пераадолеўшы міжвольнае здзіўленне, Тамара хутка супакоілася. І я, стараючыся не перашкаджаць, назірала за яе работай.

Прыгожа ўсё ў яе атрымліваецца. Прыпаўшы да акуляра мікраскопа, гібкімі пальцамі левай рукі хутка-хутка пасоўвае ўпакоўку з вырабам, так жа хутка дастае непрыгодны, замяняе новым. На імгненне адарваўшыся, устаўляе ў гняздо праверраны, бярэ наступны, і зноў уся — ва ўвазе. Знешне. Унутраны яе змест— убачыць самыя нязначныя адхіленні ад нормы, не прапусціць брак.

Тамара злёгку паварочвае галаву ў мой бок. У вачах — смяшынка. Гаворыць, нібы адгадвае думкі:

— Так, манатоннай і механічнай выглядае наша работа. Мне і самой так здаецца часам. Раней я правярала іншыя вырабы, у іх быў колер, прыемна глядзець. Да гэтых пакуль прывыкла — усё навокал бліскучым здавалася. Зараз нічога. Адзін дзень правяраю пасадку, другі — разварку. Разнастайнасць ёсць, цікава. У асноўным, зразумела, працуюць вочы і рукі, а думкі недзе далёка-далёка. Бывае, сяджу, працую і спяваю тут жа. Дарэчы, чуеце? — Тамара ўсміхаецца. — Гэта Зіна спявае.

Побач, на суседняй лінейцы, працуе Зіна Астапюк. Яны разам у хор ходзяць. Прыслухоўваюся. Сапраўды, праз мерны гул цэха далятае ледзь чутна песня.

### ДУМКА

Майстар Генадзь Мікалаевіч Бушмакін: «Тамара Сяргей добрасумленная работніца. Памойму, гэтая якасць дастаткова многа гаворыць пра чалавека. Без сумлення не можа быць нічога добрага ні ў працы, ні ў жыцці. Тамара ўсё робіць сумленна, што ні даручыш».

Мне ўспомніўся вось які эпізод. Хор павінен быў выступаць з канцэртам. Усе ўдзельнікі вызваляліся ад работы. Калі аб гэтым было аб'яўлена, Тамара Сяргей уздыхнула:

— У цэху вельмі цяжкае становішча, гэтулькі работы. Перад майстрам няёмка.

Чаго чалавек варты без гэтай унутранай, усвядомленай адказнасці за калектыў, справу, якой служыць?

### ЗАХАПЛЕННЕ

Бадай, не было выпадковасцю, што маё першае знаёмства з народным хорам год назад пачалося іменна з Тамары Сяргей. Яна першай прыйшла тады на рэпетыцыю. І ўсе восем гадоў, колькі існуе хор, ніводнай стараецца не прамінуць. Многія, з кім пачынала, даўно пакінулі калектыў. Яна засталася.

### ДУМКА

Кіраўнік народнага хору Леанід Аляксандравіч Валчок: «Тамара да самазабыцця аддадзена народнай песні. Яна салістка. Без яе цяжка ўявіць калектыў. І ніякія складанасці, а іх многа, яе не спыняюць. На рэпетыцыі і на канцэрты часта прыходзіць з дачкою».

# УПЕРШЫНЮ Ў ГАЛІНЕ

Многія падраздзяленні на ВА «Інтэграл» аснашчаны навейшымі механізмамі і ўстаноўкамі. Гэта не дзіўна. Нам неабходна крочыць у нагу з часам. Сотні рабочых прадпрыемства завяршылі мінулы год датэрмінова. Гэта стала магчымым дзякуючы іх самаадданай працы, майстэрству, вопыту. Аднак не апошняе слова тут належыць сучаснай тэхніцы. Іменна ўкараненне такіх станкоў, установак у многім садзейнічала поспеху. Сапраўды, тэхніка зараз многае значыць, аб ёй нямала гавораць, падкрэсліваючы, што за ёю — будучае. І асобае значэнне зараз надаецца рабатызацыі вытворчасці.

Тут хацелася б спыніцца на нашай гутарцы з намеснікам начальніка цэха № 32 па тэхналогіі Генадзем Паўлавічам Пудавым. Калі гутарка зайшла аб будучым падраздзялення, ён заўважыў, што праз некаторы час тут будуць устаноўлены аўтаматызаваныя лініі.

— А як цяпер ідуць справы ў падраздзяленні з укараненнем новай тэхнікі?

— Магутнасці стабільна растуць іменна за кошт прымянення новых установак, — гаворыць Г. П. Пудаў. — Вялікую ўвагу ўдзяляе гэтай справе адміністрацыя.

Цэх № 32 у многім унікальны. Тут правяраюцца навейшыя ўзоры абсталявання, укараняюцца ў вытворчасць і паспяхова функцыяніруюць. Упершыню некалькі гадоў назад устаноўлены паўаўтаматычныя ўстаноўкі. Выпрабаванне яны прайшлі на выдатна. Вынікі ўкаранення абагульняюцца. І ўжо не толькі ў іншых цэхах аб'яднання, але і ва ўсёй галіне створаны і ўведзены ў эксплуатацыю агрэгаты падобнага тыпу. Іх выкарыстанне дазволіла павялічыць прадукцыйнасць працы ў чатыры разы. Да таго ж, аблегчана праца работніц.

Але час не стаіць на месцы. Ён ставіць новыя задачы. Зноў жа, упершыню ў галіне, незадоўга да XXVI з'езда КПСС, у цэху было ўстаноўлена некалькі аўтаматаў. Праверку яны таксама вытрымалі. Зараз ідзе працэс перааснашчэння старога абсталявання на новае. Гэта у канчатковым выніку павысіць прадукцыйнасць працы. І дазволіць перайсці на шматстаночнае абслугоўванне. Не аднойчы, напэўна, кожнаму з нас даводзілася бачыць, як ткачыха адначасова працуе на дзесяці, а то і больш ткацкіх станках. Нешта накшталт гэтага ў хуткім часе мы ўбачым і ў трыццаць другім цэху. Праўда, парк абслугоўваемых установак будзе пакуль не такім шматлікім. Адна работніца зможа працаваць на трох аўтаматах. Але і гэта прагрэс немалы.

Усе пошукі па праектаванню новых установак праводзіліся аддзелам № 14 разам са спецыяльнымі цэхамі. Распрацаваны цэлы комплекс мерапрыемстваў па аўтаматызацыі і механізацыі фінішных аперацый. Здаецца, проста — адмаркіраваць гатовую прыладу. Але ўручную гэта рабіць — значыць патраціць многа часу. Зараз уся маркіроўка прылад праводзіцца аўтаматычна.

Поспех прыносіць і цесная сувязь паміж спецыялістамі цэха і работнікамі аддзела № 14. Распрацоўкі, наватарскія рашэнні, якія прапаноўваюць канструктары, заўсёды знаходзяцца ў полі зроку цэхавай адміністрацыі. На месцы, як гаворыцца, відней. У працэсе эксплуатацыі становіцца зразумелым, якія вузлы зарэкамендавалі сябе добра, а над якімі яшчэ неабходна папрацаваць. Гэтаму ў многім садзейнічаюць спецыяльна створаныя творчыя брыгады, у якія ўваходзяць інжынеры і наладчыкі. Тут выдатна працуюць энергамеханік цэха Л. П. Верасавы, інжынеры-тэхнолагі А. А. Марціновіч, А. В. Гутаў.

Паспяхова былі праведзены сумесныя работы па уніфікацыі вымяральнага комплексу для розных відаў карпусоў. Раней для кожнай прылады патрабавалася асобная ўстаноўка. У выніку праведзеных даследаванняў паявілася рэальная магчымасць выконваць даную аперацыю на адным агрэгаце, незалежна ад тыпу вырабу. Гэта сэканоміла час, узняло прадукцыйнасць працы. Аналагічныя работы былі праведзены і на іншых аперацыях. За кошт гэтага магутнасці цэха ўзраслі ў чатыры разы ў параўнанні з 1975 годам, працаёмкасць знізілася ў тры разы, высвабадзіліся дадатковыя рабочыя месцы.

— Думаю, што ў канцы гэтай пяцігодкі мы зможам ажыццявіць задуманае на практыцы, — працягвае Генадзь Паўлавіч.

Мяркуючы па тых поспехах, якія дасягнуты тут зараз, гэта сказана не проста так. За словам будзе справа. Справа, якой у цэху штодзень удзяляюць першаступеннае значэнне.

**М. ДУБОВІК,**
**карэспандэнт газеты «Интеграл».**

# ПЛЯЧО Ў ПЛЯЧО З ХЛЕБАРОБАМІ

Прынятая майскім (1982 г.) Пленумам ЦК КПСС Харчовая праграма ўспрынята савецкім народам як кроўная справа. Калектыў нашага аб'яднання таксама не стаіць у баку ад клопатаў працаўнікоў сельскай гаспадаркі. Напрыклад, у кормаўборачных камбайнах КСК-100 ёсць дэталі, якія выпушчаны ў нашых цэхах.

Але не толькі гэтым вымяраецца ўдзел калектыву аб'яднання ў ажыццяўленні Харчовай праграмы. Сталі традыцыйнымі шэфскія сувязі з земляробамі Дзяржынскага і Стаўбцоўскага раёнаў. У самыя адказныя перыяды на дапамогу калгасам і саўгасам штогод прыязджаюць шэфы-інтэгралаўцы.

У 1982 годзе ў час пасяўной і ўборачнай кампаніі ў падшэфныя гаспадаркі выязджала каля 5 тысяч рабочых, ІТР і служачых. Па ініцыятыве партыйнага бюро 27-га цэха кожны камуніст падраздзялення адпрацаваў у падшэфным калгасе імя Леніна Дзяржынскага раёна па два выхадныя дні на ўборцы тэхнічных культур.

У аб'яднанні падрыхтавана 150 механізатараў, якія ў адказны для сяльчан час выязджаюць у гаспадаркі для аказання канкрэтнай дапамогі.

Многія інтэгралаўцы паказваюць узоры працы. Возьмем, напрыклад, М. Гілевіча, рабочага 21-га цэха. Ён авалодаў спецыяльнасцю трактарыста і штогод дапамагае калгасу ў правядзенні севу. Яго ўменню зайздросцяць нават вопытныя механізатары. Вясной мінулага года у калгасе «Чырвоная зорка» Дзяржынскага раёна ён засеяў 240 гектараў збожжавых.

Аператар васемнаццатага цэха К. Курыльчык на трактары ДТ-74 апрацаваў 327 гектараў ворыва, наладчык 48-га цэха В. Пашкевіч — 320 гектараў. Такіх прыкладаў можна прывесці нямала.

На палях калгасаў і саўгасаў рэспублікі завяршаюцца пасяўныя работы. Вясну сустракаюць не толькі паляводы і механізатары. Актыўны ўдзел у гэтай важнай кампаніі прымаюць таксама і працаўнікі нашага аб'яднання.

**В. ДОЎНАР,**
**інспектар аддзела кадраў.**

Тут патрэбна сказаць, што ў Тамары быў перапынак, калі яна не магла наведваць рэпетыцыі. Чакала дзіця. Але як толькі Насця крышку падрасла, Тамара прывяла яе з сабой. У калектыве смяюцца: салістка другая расце. А для Насці тут усе сталі нібы роднымі. Яна так і гаворыць: гэта нашы.

Тамара вырасла ў сям'і, дзе вельмі любілі песню. Цёплымі майскімі вечарамі на ціхай вуліцы ў Заслаўі, дзе яна нарадзілася, часта збіраліся жанчыны. І як спявалі! Цёпла, сардэчна. Тамара ўспамінае той час з лёгкім сумам.

— Памятаю, збяруцца старэйшыя, і я разам з імі, — расказвае яна. — І вучымся спяваць: я — у іх, яны — у мяне. Розныя песні спявалі. Але мне больш народныя падабаюцца. Ёсць у іх душа... Дома ў нас усе спявалі. У маёй мамы голас пяшчотны такі, льецца, нібы крынічка. У сястры таксама цудоўны голас.

Калі на «Інтэграле» быў створаны хор народнай песні, Тамара прыйшла сюды адной з першых. З дзяцінства палюбіўшы песню, яна ўжо не магла не спяваць. Гэта стала для яе нечым больш важным, чым проста захапленне, — духоўнай патрэбнасцю, без якой жыццё не жыццё.

— Часам пасля работы думаю: можа, не ісці сёння на рэпетыцыю? Але не, не магу, ногі самі нясуць. Прыйдзеш — адпачываеш душой...

Тамара гаворыць спакойна, неяк напеўна. Так і чуюцца ўсе інтанацыі яе голасу. Вельмі цёпла расказвае пра калектыў, пра канцэрты, пра паездкі і планы.

— Зараз у нас яшчэ цікавей будзе. Раней рыхтаваліся да конкурсу, паўтаралі стары рэпертуар. Цяпер пачнём развучваць новую праграму. Нешта, зразумела, застанецца ад старой, самае любімае...

Мы ўсе схільны скардзіцца, што быт, дзеці разбураюць нашы здольнасці, пазбаўляюць таленту, не даюць магчымасці паспяваць за часам. У Тамары таксама сям'я, двое дзяцей: сын — васьмікласнік, дачцы — тры з паловай гады. Дзіўна, але Тамара ні разу не паскардзілася на недахоп часу, сіл і іншыя цяжкасці. Што ж, усяго гэтага ў яе не бывае? Проста яна ўмее пераадольваць цяжкасці. Стаць вышэй. З жадання жыць светла, давяраючыся дабру, надзеі. З пачуцця самасцвярджэння.

**В. МАРОЗАВА,**
**карэспандэнт газеты «Интеграл».**

**НА ЗДЫМКУ: Тамара СЯРГЕЙ.**

ГОД НАЗАД на вытворчым аб'яднанні «Інтэграл» пабываў касманаўт У. В. Кавалёнак. Ён выступіў перад калектывам цэха № 32. І адна з лепшых брыгад гэтага падраздзялення, якую да нядаўняга часу ўзначальвала Ірына Сулімчык, вырашыла ўключыць у свой састаў земляка, закрываць на яго нарад, а заработак пералічыць у Савецкі Фонд міру.

На днях у адрас камітэта камсамола аб'яднання прыйшло пісьмо ад Уладзіміра Васільевіча. Перад пачаткам змены камсамольска-маладзёжная брыгада сабралася разам. Сакратар камсамольскай арганізацыі цэха Святлана Рамаоўская расказала аб поспехах, дасягнутых калектывам. Яна адзначыла,




# Высокі гонар

*Нядаўна работнікі аб'яднання цёпла павіншавалі камсамольска-маладзёжны калектыў цэха № 32, які ўзначальвае Валянціна Смычок, з прысваеннем яму імя двойчы Героя Савецкага Саюза лётчыка-касманаўта СССР Уладзіміра Васільевіча Кавалёнка.*



што многія члены передавой брыгады ідуць з апераджэннем вытворчага графіка. Напрыклад, Ірына Сулімчык заданне мінулага года выканала датэрмінова, у кастрычніку. Зараз да новых перамог калектыў вядзе лепшая работніца Валянціна Смычок.

Потым Святлана Раманоўская дала слова сакратару камітэта камсамола аб'яднання Вячаславу Міхальчанку. Ён зачытаў пісьмо У. В. Кавалёнка, у якім касманаўт дзякаваў брыгадзе за аказаны яму гонар быць членам вытворчага калектыву, пажадаў работнікам поспехаў у працы, асабістага шчасця. В. Міхальчанка ўрачыста ўручыў пісьмо камсоргу брыгады Вользе Тарашкевіч. У сваім выступленні яна запэўніла, што КМК будзе з гонарам несці імя свайго земляка. На гэты год брыгада ўзяла напружаныя абавязацельствы: завяршыць заданне датэрмінова. Перадавы калектыў, падтрымліваючы пачын масквічоў «Гонар і слава — па працы!», вырашыў да мінімуму звесці ўнутрызменныя страты рабочага часу. Гэтая задача брыгадзе пад сілу. Усе работніцы выдатна ведаюць не толькі сваю аперацыю, але могуць у любую хвіліну замяніць таварыша на яго рабочым месцы. Гэта дазваляе ім пры любых абставінах не зніжаць узятыя тэмпы.

— Зараз, — гаварыла Вольга Тарашкевіч, — калі ў нашай брыгадзе побач з камсамольцамі працуе і Уладзімір Васільевіч Кавалёнак, кожны з нас адчувае двайную адказнасць за штодзённае выкананне зменнага задання, за выпуск толькі высакаякасных вырабаў.

**Т. ХОЛАД,**
**карэспандэнт газеты «Интеграл».**

**НА ЗДЫМКАХ: так аформлена працоўнае месца героя; на працоўным месцы У. В. Кавалёнка працуе А. Удалава, якая заваявала гэта права ў напружаным сацыялістычным спаборніцтве; у час мітынгу, прысвечанага прысваенню КМК імя славутага земляка.**



# ЧЫРВОНЫ КАМІСАР ГАШАК

**30 красавіка спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння вядомага чэшскага пісьменніка, аўтара сусветна вядомага рамана «Похождения бравого солдата Швейка в мировую войну», камуніста-інтэрнацыяналіста, актыўнага барацьбіта за Савецкую уладу Яраслава Гашака.**

ЛЕТАМ 1918 года над Самарай навісла пагроза захопу горада контррэвалюцыйнымі часцямі. Па рашэнню РВК, старшынёй якога быў В. У. Куйбышаў, у горадзе было ўведзена ваеннае становішча. У гэтыя трывожныя дні на мітынгах і сходах, у воінскіх часцях, на прадпрыемствах можна было сустрэць чалавека ў чырвонаармейскай форме, невысокага росту, з акруглымі рысамі твару, спакойным і крыху строгім поглядам. Гэта быў камуніст - інтэрнацыяналіст Яраслаў Гашак.

Вядомы чэшскі пісьменнік, які прайшоў праз франты першай сусветнай вайны, перажыў цяжкія дні палону ў царскай Расіі, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі свядома ўступіў у рады абаронцаў улады рабочых і сялян. Гэта быў заканамерны вынік сацыяльнага выспявання арыгінальнага таленту пісьменніка-сатырыка, ідэйнае станаўленне камуніста-інтэрнацыяналіста.

Карэнні яго ідэйнага росту знаходзяцца ў непарыўнай сувязі з народам, ва ўпартым вывучэнні рэальнага жыцця. Я. Гашак лічыў сваім настаўнікам А. М. Горкага. Чалавек з нізоў, з багатым характарам, Гашак увасобіў ў сваіх паводзінах цвярозы сэнс барацьбы з прыгнятальнікамі. Ужо ў 1911 годзе ў творчасці Я. Гашака паяўляецца бравы салдат Швейк, вобраз якога затым будзе развіты пісьменнікам у яго вядомым рамане.

Яшчэ адной асаблівасцю творчасці Я. Гашака было вострае выкрыццё буржуазнага ладу, які парадзіў няспраўядлівасць і зло ва ўсіх яго праявах. аднімаў свабоду ў народа. Ваенныя, прадстаўнікі палітычных колаў, дзяржаўныя чыноўнікі, паліцэйскія, мяшчане аўстра-венгерскай імперыі былі падняты на вастрыё сатыры таленавітага пісьменніка.

Пісьменнік - гуманіст зрабіў свой выбар — не толькі стаў на пазіцыю абароны народа сваёй творчасцю, але і прыняў непасрэдны ўдзел у рэвалюцыйнай перабудове свету. Ён выступае супраць імперыялістычнай вайны, адмаўляецца ўдзельнічаць у ёй. Прызваны ў аўстра-венгерскую армію, у 1915 годзе ён добраахвотна здаецца ў рускі палон.

З гэтага часу пачынаецца самы значны перыяд у жыцці і творчасці Я. Гашака. Дапытлівым розумам і гарачым сэрцам ён успрымае рэвалюцыйную навуку ў Расіі, вывучае тактыку бальшавікоў, вітае Кастрычніцкую рэвалюцыю. Рэвалюцыя, яе пераўтваральная сутнасць, матывы свабоды і пазбаўлення народа ад эксплуатацыі напаўняюць душу пісьменніка, пранікаюць у яго творчасць.

Страсная і захопленая натура пісьменніка, рэвалюцыянера, салдата патрабуе актыўнай дзейнасці. Я. Гашак прыязджае ў Маскву, знаёміцца з Я. М. Свярдловым, іншымі віднымі прадстаўнікамі Савецкай дзяржавы, зачытваецца артыкуламі У. І. Леніна, слухае яго выступленні на пасяджэнні Массавета і ў сакавіку 1918 года ўступае ў бальшавіцкую партыю.

Камуніста Я. Гашака накіроўваюць на работу ў Самару, дзе была небяспечнасць выступлення супраць Савецкай улады контррэвалюцыйных сіл чэхаславацкага корпуса. Малады пісьменнік становіцца страсным прапагандыстам і агітатарам, арганізатарам інтэрнацыянальных часцей Чырвонай Арміі.

У яго артыкулах, нарысах і фельетонах—набат трывогі і клопат аб абароне Савецкай улады, страсны заклік да нямецкіх, венгерскіх, чэшскіх, славацкіх, польскіх, сербскіх салдат уключыцца ў актыўную барацьбу супраць контррэвалюцыі. Вострае слова, злая сатыра, сарказм, накіраваныя супраць карнілаўшчыны, белагвардзейскага афіцэрства, рэакцыйнай буржуазіі, знаходзілі гарачы водгук у сэрцах салдат, адкрывалі праўду рабочым і сялянам сібірскіх гарадоў і вёсак.

У лютых баях з контррэвалюцыяй назапашваўся рэвалюцыйны вопыт. «Шматмоўны камісар», як называлі салдаты Я. Гашака за яго выступленні на рускай, чэшскай, сербскай, нямецкай мовах, валодаў храбрасцю, салдацкай кемлівасцю і знаходлівасцю. Вострыя фельетоны і гумарыстычныя гісторыі камісара захаплялі слухачоў. З аднолькавай цікавасцю іх чыталі і разумелі рускія, немцы, палякі, кітайцы і бураты. Перакананасць і аргументаванасць яго выступленняў запаміналіся, адкрывалі вочы рабочым і сялянам у ваеннай форме, сабраным імперыялістычнай вайной у Сібіры з усёй Еўропы і Азіі.

Камісар Я. Гашак знайшоў у Савецкай Расіі ўвасабленне сваёй мары, па яго прызнанню, сваю другую Радзіму. Пісьменнік стаў воінам, бясстрашным арганізатарам мас. Яго працалюбства спалучалася з невычэрпным жыццялюбствам. Яно напаўняла ўсю яго сутнасць, насычала публіцыстычную творчасць, выступленні перад салдатамі, рабочымі, сялянамі. Творчасць камісара - інтэрнацыяналіста запальвала моладзь, натхняла людзей розных узростаў, а чысціня і высокая мэтанакіраванасць рэвалюцыйных ідэй і задумак пісьменніка з далёкай Чэхаславакіі выклікала да яго слоў глыбокі давер.

У бесперапынных баях і ваенных паходах выспяваў талент Я. Гашака, назапашваўся матэрыял для галоўнага твора пісьменніка, які зрабіў яго бессмяротным.

Пасля вяртання ў Чэхаславакію ў канцы 1920 года Я. Гашак за кароткі тэрмін напісаў тры часткі рамана «Похождение бравого солдата Швейка в мировую войну», які заваяваў шырокае прызнанне прагрэсіўнай грамадскасці ў многіх краінах свету. Значэнне і прыцягальнасць Швейка не здолелі зменшыць ні злыя нападкі буржуазнай крытыкі, ні інквізітарскія кастры ў фашысцкай Германіі, у якіх гарэлі кнігі вядомых пісьменнікаў.

Твор вялікай мастацкай сілы і цудоўны вобраз Швейка, які ўвайшоў у плеяду народных герояў сусветнай класічнай літаратуры, стварыў майстар, натхнёны вялікімі ідэямі сацыялізму і камунізму, які прайшоў школу сацыялістычнай рэвалюцыі і падняўся да высокага ўсведамлення чалавечых каштоўнасцей, за якія змагаўся ён сам і яго герой. Гэтым дарагі Яраслаў Гашак усім, хто знаёмы з яго жыццём і творчасцю.

**А. СЛУКА,**
**кандыдат гістарычных навук, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.**

# Братэрства, змацаванае крывёю

У АКТАВАЙ ЗАЛЕ інтэрната № 7 адбыўся вечар, прысвечаны 40-й гадавіне ўтварэння на тэрыторыі СССР Войска Польскага і 38-й гадавіне падпісання Дагавора аб дружбе, узаемнай дапамозе і супрацоўніцтве паміж Польшчай і СССР. Вечар быў арганізаваны польскімі студэнтамі і аспірантамі пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства філалагічнага факультэта К. М. Гюлумянц пры актыўным удзеле савецкіх студэнтаў.

Для Польшчы красавік з'яўляецца месяцам народнай памяці, калі ўсе палякі ў думках вяртаюцца да сваёй трагічнай гісторыі, да вайны, каб задумацца над сваім мінулым, сённяшнім і будучым. У красавіку 1945 года быў падпісаны самы важны палітычны і юрыдычны дакумент — Дагавор аб дружбе, узаемнай дапамозе і супрацоўніцтве, які замацаваў паварот у савецка-польскіх адносінах і саюз двух народаў, што нарадзіўся крыху раней — у гады сумеснай барацьбы польскіх і рускіх рэвалюцыянераў з царскім самадзяржаўем, з палітычным і сацыяльным нераўнапраўем, і ўмацаваны ў гады барацьбы з германскім фашызмам, на полі бітвы, калі польскія і савецкія салдаты ўставалі на абарону свабоды і незалежнасці, свайго неад'емнага права на мірнае і справядлівае жыццё.

На вечары гучалі песні і вершы савецкіх і польскіх аўтараў, былых салдат і партызан. Мы імкнуліся расказаць пра найбольш важныя моманты ў гісторыі польскага народа з 1 верасня 1939 года — дня здрадніцкага нападу фашысцкай Германіі на нашу радзіму — да 9 мая 1945 года. Мы расказалі пра жорсткія дні несправядлівай захопніцкай вайны, пра цяжкі лёс народа, пакінутага буржуазным урадам, пра тых, хто ў цяжкі час фашысцкай акупацыі застаўся верным патрыётам сваёй радзімы. Пра гістарычны для польскага народа 1943 год, калі па ініцыятыве Саюза польскіх патрыётаў, пры падтрымцы і дапамозе Савецкага ўрада была арганізавана польская дывізія імя Тадэуша Касцюшкі. У кастрычніку 1943 года ля беларускай вёскі Леніна пачаўся баявы шлях Войска Польскага, байцы якога разам з Чырвонай Арміяй дайшлі да Берліна. Госцем нашага вечара быў ветэран Вялікай Айчыннай вайны, адзін з удзельнікаў стварэння I дывізіі Войска Польскага Р. Я. Марук. Рыгор Яфрэмавіч падзяліўся сваімі ўспамінамі аб незабыўных днях сумеснай барацьбы польскага і савецкага народаў супраць фашысцкіх захопнікаў, расказаў аб мужнасці воінаў Чырвонай Арміі і Войска Польскага. Мэтай нашага вечара было не толькі напомніць савецкім сябрам аб тым, як нараджалася і мацнела дружба паміж нашымі народамі, пазнаёміць з нашым мінулым сяброў з іншых краін свету, але і выказаць удзячнасць нашага народа савецкім людзям, якія прымалі ўдзел у вызваленні Польшчы ад фашысцкага ярма, а затым дапамаглі ёй стаць на сацыялістычны шлях развіцця.

**Ганна ЯЦКОЎСКА (ПНР),**
**студэнтка філалагічнага факультэта.**

# «Будзем ударнікамі»

У ГЭТЫМ ГОДЗЕ камітэт камсамола універсітэта фарміруе 10 будаўнічых атрадаў. Тры з іх — інтэрнацыянальныя.

Наш інтэрбудатрад «Волаты», які выедзе ў Усць-Ілімск, самы вялікі — 50 чалавек. Працаваць у ім будуць студэнты з розных краін свету: Ірака, ГДР, Кубы, СРВ, Нікарагуа і, зразумела, СССР.

Пакуль мы рыхтуемся да ад'езду. Усе байцы здалі экзамен па тэхніцы бяспекі, прайшлі медыцынскую камісію. Студэнт з СРВ Нгуэн Хах Тхай сказаў:

— Я ўжо пяць гадоў вучуся ў БДУ імя У. І. Леніна. Вельмі люблю прыроду Беларусі. Хочацца папрацаваць у студэнцкім будаўнічым атрадзе, каб мая праца стала маленькім ручайком у магутнай рацэ будаўніцтва камунізму ў СССР, хочацца сваімі вачыма ўбачыць прасторы радзімы У. І. Леніна. У в'етнамскіх студэнтаў такі дэвіз: у час вучобы — займацца на выдатна, летам працаваць па-ўдарнаму.

— Жыццё не толькі ў аўдыторыі,—сказаў мне студэнт III курса фізфака кубінец Дапер Гарыа Раманда.—Я лічу, што той студэнт, які не пабываў у будатрадзе, — гэта не сапраўдны студэнт. І таму сам я кожнае лета працую ў СБА.

На сходзе атрада наш камандзір Мікалай Даміно паглядзеў на нас і спытаў:

— Будзем ўдарнікамі?

Мы дружна адказалі:

— Будзем!

**ЗЫОНГ ШОН,**
**студэнт III курса факультэта журналістыкі.**



**НА ЗДЫМКУ:** экзамен па тэхніцы бяспекі здае Урбіна МАТАМОРА.

Фота **С. Плыткевіча.**

**Рэктарат, партком, прафком выкладчыкаў і супрацоўнікаў, камітэт камсамола Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна выказваюць глыбокае спачуванне рэдактару газеты «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» В. П. ВАРАБ'ЁВУ ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Супрацоўнікі і аўтарскі актыў рэдакцыі газеты «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» выказваюць глыбокае спачуванне рэдактару В. П. ВАРАБ'ЁВУ з выпадку напаткаўшага яго вялікага гора— заўчаснай смерці БАЦЬКІ.**


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
28 красавіка 1983 г.
Зак. 797 АТ 04199

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
А. І. ЛАЗОЎСКІ